**Красоўскі, Д.** А ён жыве ў сэрцвы маці / Д. Красоўскі // Полацкі веснік. — 1997. — 31 кастр. — С. 2.

## А ЁН ЖЫВЕ Ў СЭРЦЫ МАЦІ



У сярэдзіне верасня мне давялося пабываць на станцыі Алёшча. Яшчэ,ў цягніку ўспомніў, што тут жыве маці загінуўшага воіна-афганца Ларкова Улляна Фядотаўна. Захацелася наведаць гэту жанчыну, даведацца, як яна адчувае сябе пасля перажытага гора, смерці любімага сына, што яе турбуе ў наш нялёгкі час. Але перш, чым наведаць яе, захацелася пагутарыць з жыхарамігэтай невялічкай станцыі, аддаленай ад раённага цэнтра. Убачыўшы невялікую групу жыхароў, падышоў да іх і разгаварыўся. Размова пайшла аб жыццевых праблемах. Міжволі адна з жанчын задала мне пытанне, ці ведаю я пра маці загінуўшага воіна-інтэрнацыяналіста. Другая, цяжка ўздыхнуўшы, дадала, што многа гора выпала на долю гэтай жанчыны.

Жаданне маё наведаць Улляну Фядотаўну значна ўзмацнілася. Я запытаўся, а як знайсці яе хату. Мне падрабязна расказалі, а невялічкі хлопчык прапанаваў паслугу паспадарожнічаць са мной. Аказваецца дом маці загінуўшага ў той вайне ведаюць усе, ад старога да малога.

І вось я каля дома Улляны Фядотаўны. Перш, чым зайсці ў хату, прачытаў надпіс на мемарыяльнай дошцы;

**«В этом доме жил  Ларьков Петр, комсомолец, с честью •выполнивший свой интернациональный долг в Афганитане».**

І тут мне насустрач выйшла прыветлівая, гаваркая жанчына. Яна шчыра запрасіла мяне ў хату. Але перш чым прапанаваць мне зняць верхнюю вопратку, паказала партрэт, загінуўшага сына, які вісіць на бачным месцы, і, змахнуўшы няпрошаную слязу, ціха сказала: «Вось мая радасць, а найбольш боль, якую ён прынёс мне не па сваёй віне».

Я ўгледзеўся ў партрэт гэтага мужнага маладога хлопца ў вайсковай форме, малодшага сяржанта і вельмі пашкадаваў, што не прынёс з сабой кветкі, каб у прысутнасці маці ўшанаваць памяць чалавека, з гонарам выканаўшага свой воінскі абавязак.

Пад партрэтам Пятра я прачытаў вершаваныя радкі, якія трапна характарызавалі яго гераічны ўчынак. Мушу прызнацца, што я не спытаў маці, хто з 'яўляецца аўтарам гэтых пранікнёных слоў.

Потым мы доўга гутарылі. Улляна Фядотаўна аказалася цікавым субяседнікам. Яна расказвала, што ў той год, прыкладна за два месяцы да гібелі сына, яна пахавала любімага мужа, а пахаванне сына помніць ужо смутна. Пасля ўсяго гэтага доўгі час цяжка хварэла, бо не вытрымала нервовая сістэма.

Праз некалькі хвілін яна прынесла сямейныя альбомы і ўсё тое, што звязана з сынам.

Гартаючы старонкі альбома Пятра, яна ўспамінала падрабязна старонкі яго жыцця. А калі паказвала пісьмы ка-мандзіра вайсковай часці, дзе служыў сын і ордэн «Чырвонай Зоркі», якім ён узнагароджаны пасмяротна, у яезноў з 'явіліся слёзы. Мяне вельмі ўразілі пры гэтым яе словы:«Няма, мабыць, нічога цяжэйшага, як бацькам перажыць дзяцей».

Прайшло некалькі хвілін, і нешта ўспомніўшы, яна выйшла ў другі пакой і тут жа вярнулася са школьным сшыткам у руках.

Аказалася, што ў гэтым сшытку запісана некалькі вершаў былой настаўніцы Маласітнянскай школы Н. Ц. Вебко, з якой Ульяна Фядотаўна падтрымлівае сяброўскую сувязь. Я ўважліва перачытаў вершы. Мяне ўразілі асабліва вось гэтыя радкі:

**«Постарела без времени мать,**

**Пережить ей как горе такое!**

**Остамлось три месяца ждать,**

**Только сын не вернулся из боя».**

Паклаўшы сшытак, я спытаў у маці, а дзе ж яе другія дзеці. Яна адразу неяк ажывілася і з гонарам сказала, што старэйшы сын Аляксандр працуе ў адным *з* калгасаў Віцебскага раёна. Дачка Валянціна — на аршанскім ільнокамбінаце. А потым вельмі цёпла загаварыла пра ўнукаў. Тут жа з усмешкай сказала, што маленькага Дзіму называе Пецем, бо знешне і па дзіцячых па вадках ён вельмі падобны на яе загінуўшага сына.

Каб неяк зменшыць боль і гора Ульяна Фядотаўна прымае актыўны ўдзел ва ўсіх мерапрыемствах, звязаных з афганскай вайной. Яна добра ведае кіраўнікоў рэспубліканскага, абласнога савета воінаў-інтэрнацыяналістаў, супрацоўнікаў музея, які два гады таму адкрыты ў Віцебску, беражна захоўвае дакументы і перыядычныя выданні, дзе пералічаны загінуўшыя воіны-афганцы.

У канцы нашай размовы я яшчэ раз узяў той самы школьны сшытак, яшчэ раз паспачуваўшы ёй, прачытаў вытрымку з верша.

**«Вы сумели и горе ослить,**

**Вы сумели и боль победить,**

**Чтобы было кому-то о сыне**

**В сердце светлую память хранить».**

Добрага Вам здароўя, Ульяна Фядотаўна, дабрабыту, вытрымкі і чалавечага шчасця.

**Д. КРАСОУСКІ**